Источник: "Настаўніцкая газета" - 2013-06-15



# Цвяток радзімы васілька, або Слова ажывае праз стагоддзі

## *Праз стагоддзе пасля выдання зборніка "Вянок" спраўдзілася паэтычная фантазія Максіма Багдановіча*

**Штосьці ёсць у тым меркаванні, нібыта навакольны свет можа адчуць самыя запаветныя памкненні душы, яркія і моцныя вобразы, народжаныя свядомасцю – і адлюстраваць іх у рэальнасці. Нездарма столькі легенд спрадвеку існуе вакол таленавітых мастакоў: хто як не яны здольныя акумуляваць пачуцці дзясяткаў, часам соцень і мільёнаў людзей, каб потым выплюхнуць яе ў пранізліва ясным пасланні да сучаснікаў і нашчадкаў — простым, як святло, і такім жа бясконца загадкавым. А потым твор набывае ўласнае жыццё, і з цягам часу яго энергетыка толькі ўзрастае...**

"Цвяток радзімы васілька" — полісемічны вобраз, які стаў неад'емнай часткай беларускай культуры і непарыўна пераплёўся ў свядомасці пакаленняў з вобразамі прыгонных мастачак і іх творчасці. Першыя васількі зацвітаюць у чэрвені-ліпені. Якраз у чэрвені 1911 года Максім Багдановіч наведаў Вільню і ўпершыню пабачыў знакамітыя слуцкія паясы. Наймацнейшае ўражанне стала вытокам верша, апублікаванага ў "Нашай ніве" праз год – таксама ў чэрвені. Але набыткам шматмільённай чытацкай аўдыторыі "Слуцкія ткачыхі" сталі пазней, пасля выхаду зборніка "Вянок". З лёгкай рукі Паэта слуцкія паясы – ужо не проста ўзор майстэрства продкаў, а ці не ў першую чаргу геніяльнае абагульненне з хрэстаматыйнага школьнага твора — набылі значэнне нацыянальнага сімвала.

"Сакрэт вырабу паясоў незваротна страчаны" — доўгі час гэта лічылася сумнай аксіёмай. Вось толькі ў самой існасці чалавечай закладзена прага пераступаць такія бясспрэчныя на першы погляд ісціны, імкнуцца да немагчымага. Праз стагоддзе пасля напісання верша ідэя афармілася ў перспектыўны праект і атрымала падтрымку на самым высокім узроўні. Згодна з Дзяржаўнай праграмай адраджэння тэхналогій і традыцый вырабу слуцкіх паясоў і развіцця вытворчасці нацыянальнай сувенірнай прадукцыі "Слуцкія паясы" на 2012—2015 гады ўжо мінулым летам пачалося непасрэднае ажыццяўленне задумы. "Хросным бацькам" слуцкага пояса XXI стагоддзя стаў Віцебскі дзяржаўны тэхналагічны ўніверсітэт — менавіта тут працуе адзін з самых аўтарытэтных (не толькі ў рэспубліцы, але і за мяжой) спецыялістаў лёгкай прамысловасці Галіна Казарноўская, якой было даручана на сучасным узроўні рэканструяваць тэхналогію. І задача была вырашана! Унікальны шасцічаўночны станок з электронным кіраваннем, які дазволіць выкарыстоўваць машыннае і ручное ткацтва, па тэхнічным заданні беларусаў ўзяліся выканаць нямецкія партнёры. Зараз гэты этап работы блізкі да завяршэння.

— Дэталёвае вывучэнне ўзора паказала: мы маем справу з простай на выгляд, але найскладанейшай па структуры тканінай, — расказала Галіна Васільеўна. — За ўвесь час сваёй працы не сустракала нічога падобнага. Застаецца здзіўляцца майстэрству ткачоў, якія ўручную маглі ствараць такія шэдэўры! Пры ўмове, што будзе своечасова зманціравана абсталяванне, да канца чэрвеня мы зможам саткаць эталон — дакладную копію аднаго з паясоў, што захоўваецца ў Цэнтры даследавання беларускай культуры, мовы і літаратуры НАН Рэспублікі Беларусь. Розніца будзе толькі ў матэрыяле: эталон вырабляецца з сыравіны, што адрозніваецца ад той, з якой потым будуць сатканы аналагі. Дарэчы, мяркуецца, што абодва аналагі – з натуральнага шоўку і залатых нітак і з натуральнага шоўку і срэбных нітак – пабачаць свет у Слуцку.

Калі браць за аснову пазначаную на вокладцы дату выхаду "Вянка" з друкарні, вытворчасць паясоў адновіцца... праз стагоддзе пасля публікацыі зборніка Багдановіча! Магія слова, прароцтва ці проста выпадковае супадзенне? Тады ўжо няхай будзе яшчэ адно. Агульнавядома, што паэт у вершы міжволі дапусціў недакладнасць: старажытныя слуцкія паясы ткалі выключна мужчыны. А вось зараз, відавочна, справа пераходзіць у жаночыя рукі. Так што Галіну Казарноўскую разам з яе калегамі і паплечніцамі са Слуцка з поўным правам можна назваць першымі слуцкімі ткачыхамі...

**Таццяна БОНДАРАВА.**

Таццяна Бондарава. Цвяток радзімы васілька, або Слова ажывае праз стагоддзі